ДУА «Міёрская  сярэдняя школа № 2 імя М. Р. Ізварына»

# Праект аднаго дня
# «Не пакідайце ж мовы роднай…»

Складальнік  Сушко В. І.

## ПРАЕКТ АДНАГО ДНЯ “НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ РОДНАЙ…”

**Актуальнасць праекта**

*Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы...*

*Цётка*

Мова – частка чалавечай культуры, гістарычнай спадчыны. Дзякуючы ёй, працягваюць жыць традыцыі. Мова абуджае цікавасць да пазнання свету, садзейнічае праяўленню павагі да мінулага і служыць элементам аб’яднання людзей незалежна ад месца і часу іх пражывання.

Зараз у нашым рознакаляровым і рознагалосым свеце налічваецца больш за шэсць тысяч моў. Палова з іх пад пагрозай знікнення. Дзеля захавання моў, якія апынуліся на парозе знікнення, міжнародны фонд UNESCO абвясціў дзень роднай мовы — каб хоць у такі дзень на іх загаварылі, пра іх успомнілі.

Кожная мова па-свойму цудоўная і непаўторная.  Адны з іх вабяць сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю, другія – мілагучнасцю. Але ў кожнага чалавека ёсць толькі адна родная мова, якая завецца роднай. Менавіта на гэтай мове ён размаўляе з роднымі, сябрамі, знаёмымі. І вельмі дрэнна, калі чалавек пачынае забывацца на сваю мову, не шануе яе.

А родная мова шмат не патрабуе. Але калі ўжо назваў яе роднай, калі лічыш яе такой для сябе — павінен жа быць перад ёй хоць нейкі абавязак. Ці хоць часам пра яе думаць. Калі хоць палова з тых сямідзесяці чатырох працэнтаў, якія падчас апошняга перапісу назвалі роднай мовай беларускую, падумае аб яе лёсе — значыць, не ўсё яшчэ страчана. Хоць адзін дзень, калі будзе яе афіцыйнае міжнароднае свята.

Калі мы чуем яе – ці то сучасную літаратурную, ці змешаную “трасянку”, або мясцовую дыялектную – то гэта ўсё яна — наша беларуская мова.

Дадзены праект  дазволіць узгадаць удзельнікам, што  мова – гэта сапраўды наша багацце. Ведаць і абараняць яе – наш абавязак.

У праекце прадугледжана стварэнне для вучняў сітуацыі поспеху: кожны мае права самастойна вызначыць ступень удзелу ў ім, выбраць мерапрыемствы, цікавыя для сябе.

**Мэта і асноўныя задачы праекта**.

*Мэты:* абуджэнне павагі да слова, імкненне захоўваць сваю культуру і культуру іншых народаў.

*Задачы*:

- стварыць умовы для асобасна значнага ўдзелу вучняў у рэалізацыі праекта;
- развіваць пазнавальную актыўнасць вучняў  і іх творчыя здольнасці;
- развіваць сродкамі мовы інтэлектуальную, эмацыянальную, эстэтычную, маральную сферу асобы навучэнца;
- выхаваць павагу да ўсяго роднага, беларускага.

**Удзельнікі праекта.**

Вучні 5 – 11 класаў, настаўнікі ўстановы адукацыі.

Кіраўніцтва дзейнасцю па рэалізацыі праекта будзе здзяйсняць Савет кабінета беларускай мовы і літаратуры.

**Механізм рэалізацыі праекта.**

Праект разлічаны на адзін дзень. На працягу гэтага часу арганізуецца індывідуальная і сумесная дзейнасць вучняў. Настаўнікі здзяйсняюць дапамогу і падтрымку дзяцей у гэтай дзейнасці.

**План мерапрыемстваў у рамках праекта**.

| № п/п | Мерапрыемства |
|---|---|
| 1. | Інтэрактыў "Скарбонка роднай мовы" |
| 2. | Конкурс перакладчыкаў "Не маўчы па-беларуску!" |
| 3. | Класная гадзіна "Гучы, родная мова!" |
| 4. | Спецвыпуск газеты "Беларусачка" |
| 5. | Інтэрнэт-віктарына "Жывое ў вяках беларускае слова" |
| 6. | Калаж "Дзень роднай мовы" |
| 7. | Акцыя "Ад слова да сэрца" |
| 8. | Відэасалон "Гучы родная мова" |
| 9. | Віктарына "Знатакі роднай мовы" |
| 10. | Літаратурная гадзіна "Чытаем вершы на роднай мове" |
| 11. | Інфармацыйная дошка "Размаўляем па-беларуску" |
| 12. | Забава "Падарожжа ў краіну роднай мовы" |

**Прагназіруемы вынік рэалізацыі праекта**.

Да асноўных вынікаў можна аднесці наступныя:

- пашырэнне ведаў вучняў па беларускай мове
- вызначэнне уласных каштоўнасцяў;
- набыццё камунікатыўных уменняў пры зносінах і ўзаемадзеянні з іншымі людзьмі.